*Пінская цэнтральная раённая бібліятэка*
*імя Яўгеніі Янішчыц*
*225710*
*г. Пінск, вул. ІПД, 35*
*тэл. 8 (0165) 32 23 66*
*e-mail: crbpinsk@tut.by*

Складальнік,
Камп’ютарны набор і афармленне К. Л. Міхалевіч

Рэдактар
і адказны за выпуск А. І. Анташук

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Міхаіл Башчук



Літаратурная спадчына Піншчыны



**Жыццём паспей дабро тварыць,**
**Агмень натхнення запалі —**
**Хай зорыць людзям без граніц**
**На гэтай праведнай зямлі.**

**Міхаіл Башчук**



## Бібліяграфія:


32. Творчы вечар ветэрана // Народная трыбуна. – 2016. – 19 лютага (№ 8). – С. 3
33. Ляшук, М. З плеяды дон Кіхотаў, альбо Рыцар абавязку, які напісаў “Гімн Меліяратараў” / Марыя Ляшук // Народная трыбуна. – 2015. – 5 чэрвеня (№ 23). – С. 2
34. Слово о юбиляре // Пінскі веснік. – 2014. – 25 лютага (№ 16).
35. Волшебный мир поэзии: поэзия Михаила Бощука // Пінскі веснік. – 2011. – 23 снежня. – С. 12
36. Ильенков, В. Праздник будет с гимном: “Гімн меліяратараў” Михаила Бощука / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2010. – 4 чэрвеня. (№44) – С. 12
37. Смирнова, Т. Знакомьтесь: Михаил Бощук, автор Гимна мелиораторов / Интервью провела Татьяна Смирнова // Живая вода.— 2010.—5 июня (№ 24-25) .— С. 6
38. Бощук, М. Стали песнями стихи / Михаил Бощук // Пінскі веснік. – 2008. – 18 студзеня
39. Пятрова, С. Пінчаніну – прыз “Бронзавае пяро”: трэцяе месца прысуджана М. Башчуку за падборку вершаў “В строю живу надеждой” з цыклу “Солдатская тетрадь” / Святлана Пятрова // Пінскі веснік. – 2008. – 18 ліпеня
40. Петрова, С. И стала “Пралеска” песней…: [стихотворение М. Бощука стало песней] / Светлана Петрова // Пінскі веснік. – 2007. – 7 снежня. – С. 12
41. Козакевич, В. След на земле / Валерий Козакевич // Пінскі веснік. – 2005. – 3 чэрвеня
42. Міхаіл Башчук: “З павагай слова чытача” // Пінскі веснік. – 2005. – 21 кастрычніка. – С. 3
43. Шушко А. На жыццёвых хвалях…: Міхаіл Паўлавіч Башчук / Анатоль Шушко // Пінскі веснік. – 2004. – 4 чэрвеня
44. Знакомьтесь: Михаил Бощук // Пинская неделя. – 2000. – 4 февраля

17. Башчук, М. Камень: верш / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2011. – 2 жніўня
18. Башчук, М. Сёння я скажу…: верш / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2011. – 30 жніўня
19. Башчук, М. З днём закаханых!: верш / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2011. – 14 лютага
20. Башчук, М. Пад ветразем «Струменя»: вершы / Міхаіл Башчук // Кружева полесских зарниц: сб. стихов и прозы / лит. об-ние «Струмень»; сост. М. И. Ляшук. – Брест: Альтернатива, 2011. – С. 5-32
21. Бощук М. Победа: стихотворение / Михаил Бощук // Белой вежи свет: сб. поэзии Брестчины / сост. и пер. с бел. В. Гришковца. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. – С. 161-164
22. Башчук, М. Жыві зямля! / Міхаіл Башчук // Заря. – 2010. – 24 декабря
23. Бощук, М. Осень / Михаил Бощук // Живая вода. – 2009. – 28 ноября; 24 октября
24. Башчук, М. Сівізна ў бараду… / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2009. – 4 верасня
25. Башчук, М. Ты, Святая зямля / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2009. – 5 чэрвеня
26. Башчук, М. Беларусі / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2009. – 2 ліпеня
27. Бощук, М. Утро / Михаил Бощук // Неман. – 2008. – № 10. — С. 139
28. Башчук, М. “Парэчча” парк / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2007. – 3 жніўня
29. Башчук, М. Пралеска: Яўгеніі Янішчыц / словы Міхаіла Башчука; муз. Юліі Фескінай // Пінскі веснік – 2006. – 17 лістапада. – С. 12
30. Башчук, М. Перамога: вершы / Міхаіл Башчук // Полесская правда. – 2003. – 1 мая
31. Башчук, М. Вершы / Міхаіл Башчук // Пинская неделя . – 2000. – 4 февраля



# Гімн меліяратараў

*словы М. Башчука*

*музыка М. Цурканава*

**Прастор палёў і там жа — дрэны-жылы,**
**Затокаў сінь, каналы напрасткі -**
**Старанна на балоце палажылі**
**Мы ў спадчыну, як родныя бацькі.**

**Прыпеў:**
**Меліяратары!**
**Тварцы вы на зямлі.**
**Меліяратары,**
**Зрабіць вы цуд змаглі.**
**За нівы хлебныя,**
**Лугі зялёныя**
**Пашана вам і слава на вякі!**

**Шчыруем на асвоеным раздоллі,**
**Спрадвеку дзе шапталі чараты**
**З вятрамі сёння годна тут аб долі**
**Гамоніць колас важкі, залаты.**
**Прыпеў.**

**Вітае песня жніўная на полі**
**У светлы дзень любові і надзей.**
**Не змые час паводкаю ніколі**
**Зямны наш след у памяці людзей.**
**Прыпеў.**








# Старонкі жыцця

Міхаіл Паўлавіч Башчук нарадзіўся 25 лютага 1944 года ў вёсцы Парэчча, Пінскага раёна, Брэсцкай вобласці.

Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, дзе, напрацягу васьмі гадоў набываў спецыяльнасць інжынера-гідратэхніка. У 1963 годзе забралі ў армію - тры гады адслужыў танкістам. Пасля службы ў 1969 годзе атрымаў дыплом.

Пасля вучобы па размеркаванні трапіў Міхаіл Паўлавіч у Лунінецкае БМУ і парцаваў там майстрам. Потым ён атрымаў пасаду праараба і ў 1971 годзе яму даручылі стварэнне Палесскай вопытнай станцыі ў Лунінецкім раёне. На гэтым аб’екце Міхаіл Башчук стаў арганізатарам камсамольска-маладзёжнага руху ў “Галоўпалессеводбудзе” - ударнай камсамольска-маладзёжнай будоўлі ЦК ВЛКСМ па асушэнні зямель і будаўніцтве саўгасаў на Беларускім Палессі. Пасля завяршэння будаўніцтва Палескай вопытнай



## Спіс літаратуры

### Творы:


1. Бощук, М. Победа: стихотворение / Михаил Бощук // Полесская правда. – 2015. – 11 июля (№ 54). – С. 4
2. Башчук, М. Абелiскi / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2015. – 2 ліпеня (№ 53). - С.10.
3. Бощук, М. Победа: стихотворение / Михаил Бощук // Живая вода. – 2015. – 9 мая (№ 18). – С. 4
4. Башчук, М. Каляднае / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2015. – 9 студзеня (№ 3). - С. 8
5. Башчук, М. Я хацеў бы… / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2014. – 3 кастрычніка
6. Башчук, М. Радзіме / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2014. – 1 ліпеня
7. Башчук, М. Ліст з Палесся; Калегу-меліяратару: вершы / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2014. – 30 мая
8. Башчук, М. З Новым годам! / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2014. — 3 студзеня
9. Бощук, М. Жди меня / Михаил Бощук // Пінскі веснік. – 2013. – 8 лістапада
10. Башчук, М. Гімн зямлі / Міхаіл Башчук // Белорусская нива. – 2013. – 28 сентября (№ 176). — С.1
11. Башчук, М. Гімн каханню / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2013. – 30 жніўня
12. Башчук, М. Радзіме / Міхаіл Башчук // Белорусская нива. – 2013. – 2 июля
13. Башчук, М. Гімн меліяратараў: верш / Міхаіл Башчук // Белорусская нива. – 2013. – 18 июня (№ 107). – С. 3
14. Башчук, М. Покліч: верш / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2013. – 31 мая
15. Башчук, М. Ясельда: верш / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2013. – 22 лютага
16. Башчук, М. Восень: верш / Міхаіл Башчук // Пінскі веснік. – 2012. – 10 лютага; 26 кастрычніка



М. Бощук на заседании литературного объединения «Струмень».



М. Башчук на прэзентацыі кніг М. Еланеўскага ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц



М. Башчук у в. Пінкавічы на свяце паэзіі да юбілея Я. Коласа (1-ы справа)



М. Башчук на адкрыцці клуба пісьменнікаў Піншчыны “Пінчукі ” у цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц



станцыі накіравалі Міхаіла Паўлавіча галоўным інжэнерам у ПМК-24 г. п. Лагішын. Затым працаваў начальнікам Ляхавіцкай ПМК, трохі пазней - начальнікам тэхнічнага аддзела трэста “Піінсквадбуд”. А з 1976-га па 2001-ы - галоўны інжэнер Пінскага міжраённага ўпраўлення асушальных і арашальных сістэм, тут ён працаваў да выхаду на пенсію.



За шматгадовую, актыўную, высокапрафесіянальную, добрасумленную працу ўзнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Вершы пачаў пісаць яшчэ ў юнацтве. Час ад часу яны з'яўляліся ў перыядычным друку. Апошнім часам іх можна сустрэць на старонках рэспубліканскіх выданняў, у газеце «Вместе», часопісах «Акно», «Нёман», абласной газеце «Заря», гарадской газеце «Пінскі веснік». Рэгулярна друкаваўся ва ўсіх выпусках рэспубліканскага альманаха «Гоман». Сябар яго рэдакцыйнай калегіі. Уладальнік «Бронзавага пяра» ў намінацыі «Паэзія» за 2007 год. Адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў “Струменя” серебряные струны» (2008 г.), «Подыхам адзіным» (2009 г.), член клуба пісьменнікаў Піншчыны “Пінчукі”. Аўтар Гімна меліяратараў Рэспублікі Беларусь.

Творчасць Міхаіла Паўлавіча Башчука неразрыўна звязана з яго малой Радзімай, вёскай Парэчча. У гэтым маляўнічым кутку нарадзілася і наша знакамітая паэтка Яўгенія Янішчыц.




Ён добра ведаў паэтэсу, захапляўся яе вершамі, ласкава называў пралескай і прысвяціў верш "Пралеска", які стаў песняй.





**Песні заспявала стогалоса,**
**Што твае стварылі песняры,**
**Расчасаўшы сонечныя косы**
**Раніцы - чароўнае пары.**

**І не моўклі днямі ліхалецця**
**Песні дарагіх тваіх сыноў,**
**Што ўзнеслі сцяг жыцця над смерцю,**
**Каб яно крынічыла ізноў.**

**Пад нагамі ката-супастата**
**Край збалелы помстаю палаў.**
**Кожны сын твой стаў тады салдатам.**
**Смелай партызанкай ты была!**

**Молатам, сярпом стальным ды плугам**
**Вызначаеш лёсу свой прасцяг.**
**Помнік Міру - цытадэль над Бугам -**
**На скрыжалях  нашага жыцця.**

# Беларусі

**Беларусь... О, родная старонка!**
**Як малітву, вымаўляю я не раз.**
**Чую: светла, молада і гонка**
**Песніць Вызвалення светлы час.**

**Выспявае свята ў небе чыстым,**
**Тчэцца гул святых тваіх званоў**
**Даляглядам луга шаўкавістым,**
**Каласамі ліпеньскіх палёў.**

**Дні імкнуць, складаюць год за годам**
**З той пары, як нарадзіўся кліч:**
**«За пасад пачэсны між народаў!»**
**Ён набатам праведным гучыць.**

**Стала ты сястрой у сям'і вялікай.**
**Зданню знік - цяпер ужо навек -**
**Край лучыны ды балотаў дзікіх**
**Шчасным быў каб кожны чалавек.**







# Пралеска

***Словы Міхаіла Башчука***
***Музыка Юліі Фескінай***

*Яўгеній Лішчыц*

Успыхнуў нясмелым світанкам
Над Рудкаю слоў тваіх сплаў.
Пяшчотным ды сонечным ранкам
Цябе я Пралескай назваў.

Прыпеў:
Пралеска, пралеска ля ўзлесся.
Ты — кветка пары маладой.
Гамонка бруіла Палессем
Вірлівай крынічнай вадой.

Тым, вытканым часам спатканнем,
Узнёслым у сэрцы жыву.
Завуць цябе птушкаю каняй…
А я ўсё Пралескай заву.

Прыпеў
Прастор нашай роднае мовы
Разліўся ў вершах тваіх,
Бы Ясельда плынню вясновай —
Жывое вады ручаін.

Прыпеў.
Святліца твой німб над Палессем.
І зорыць раса мураву.
Я зноўку народжанай песняй
Пралескай цябе назаву.

# След на земле

***Валерий Козакевич***

Все в современном мире нестойко, переменчиво. Сегодня - судят, завтра - почитают или наоборот. В каждом мнении своя правда. Однако я знаком с человеком, которого нельзя не уважать.

Запомнились его пожелания: «Главная задача младшего поколения, сменившего нас на трудовом посту - не предать забвению мелиоративный подвиг дедов, отцов, старших товарищей, которые в 60-80-е годы прошлого столетия совершили его, не считаясь с растраченными здоровьем и временем».



Ценители поэзии, которых немало среди читателей «Пінскага весніка», наверняка помнят имя этого человека.

Его стихи отличаются яркой темой патриотизма. Глубина содержания берет начало в завидном неравнодушии Михаила Павловича к окружающему миру.

Сегодня его произведения посвящены делу всей трудовой жизни. Он не может не болеть за природу дорогого Полесья. Художественное слово скажет за себя, найдет отзыв в душах тонких, чутких...

Хочется поблагодарить Михаила Павловича за пример красивой человеческой жизни и поздравить с праздником мелиораторов.



# Гімн зямлі

Асенні сон нячутна ахінае
Салодкай стомай роднае сяло.
Я ў памяці мінулае гартаю.
Было яно?.. А можа й не было.

Знікае даль. Туманам засцілае
Той вечаровы, зыбкі небакрай.
А думак рой трывожны не сціхае…
О дай жа, Божа, сонейка мне, дай!

Яно узышло над любаю зямлёю.
І на душы натхнення - шырыня!
Так будзе гімн! Бо кліча за сабою
У помнае няспынна цішыня.

Пайду туды, дзе дольныя стрыжалі...
Дзе каласуюць кніжныя палі,
Якія мы прасторамі праклалі
Нашчадкам на асвоенай зямлі.

Жыві зямля! Твары святое людзям.
Хай ткуцца кросны лепшага жыцця
Прастуе час… ніколі не забудзем
Цярністы шлях, што вывеў з небыцця.

А памяць мне адгортвае ўсё даты…
Было яно, мінулае, было!..
Хай песнямі крылатымі на святы
Зноў пад гармонік поўніцца сяло!..